# КАМУНІКАТЫЎНЫЯ ПРАКТЫКІ МОЛАДЗІ Ў БЕЛАРУСКАЙ ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ: ШТОДЗЁННЫ І АБРАДАВЫ АСПЕКТЫ

***В. І. МІШЫНА, старэйшы выкладчык***
*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт імя Еўфрасінні Полацкай,*
*Наваполацк, Рэспубліка Беларусь*

Традыцыйная культура, як і жыццё традыцыйнага грамадства ў цэлым, характарызуецца высокай ступенню рэгламентаванасці ўсіх бакоў і сфер чалавечага жыцця (вытворчай, штодзённа-пабытовай, сямейнай, святочна-абрадавай). Адной з праяваў рэгламентацыі з'яўляецца выразная дыферэнцыяцыя тэмпаральных параметраў традыцыйнага ладу жыцця, якая палягае ў якасна адрозных характарыстыках штодзённага і святочнага (абрадавага) часу. У сваю чаргу, будзённы і абрадавы кантэксты вызначаюць характар і змест паводзін і дзейнасці чалавека (напрыклад, забарона працы і неабходнасць выканання пэўных абрадавых дзеянняў у святочныя дні).

Заканамерна рэгламентаваны характар у межах традыцыйнай супольнасці набываюць і камунікацыйныя працэсы, паколькі тая ці іншая мадэль камунікацыі можа быць уласціва толькі пэўнаму абраду, або, наадварот, дзейнічаць толькі ў межах штодзённа-пабытовых зносін. Пры гэтым для прадстаўнікоў розных полаўзроставых груп (дзяцей, моладзі, дарослых, старых) характэрны розныя па змесце і скіраванасці камунікатыўныя практыкі.

Скіраванасць фокусу ўвагі на моладзь у дадзенай працы абумоўліваецца спецыфікай самой моладзевай субкультуры, якая ў традыцыйным грамадстве (як, дарэчы, і ў сучасным) вылучаецца пэўнай адасобленасцю ад іншых полаўзроставых груп. Паводле меркавання Т. А. Бернштам, "выключнае значэнне, якое надавалася дадзенаму ўзросту ў традыцыйнай свядомасці, адбілася ў асаблівым становішчы моладзі ў калектыве, яе спецыфічных функцыях і паводзінах у гаспадарчай, пабытовай і рытуальнай сферах, а таксама ў развітой сістэме ўзроставага сімвалізму" [1, с. 7].

У межах традыцыйнага грамадства адной з галоўных статусных характарыстык моладзі з'яўляўся свайго роду памежны, лімінальны стан паміж групамі дзяцей і дарослых. Спецыфіка моладзевага статусу вызначалася і неабходнасцю падрыхтоўкі да будучага сямейнага жыцця як у гаспадарча-вытворчым, так і ў соцыякультурным накірунках.

Гаспадарча-вытворчы накірунак прадугледжваў авалоданне асноўнымі гаспадарчымі навыкамі і ўменнямі да моманту ўступлення ў шлюб. Як вядома, ва ўмовах традыцыйнай эканомікі занятасць маладых людзей гаспадарчымі справамі была абавязковай, і павялічвалася па меры сталення: "З 12 год для хлопчыка пачынаюцца першыя практыкаванні ў земляробстве: ён зграбае сена, баранує, з пятнаццаці год бярэцца за цэп, касу, а яшчэ гады праз два і за саху, так што да 20 год ён ужо хлебароб, што прайшоў усе акадэмічныя курсы сялянскай гаспадаркі. Дзяўчына да 16-17 год ведае жаночыя работы" [2, с. 17].

Соцыякультурны накірунак, у сваю чаргу, вымагаў ад маладых людзей удзелу ў разнастайных формах грамадскай актыўнасці як у штодзённым, так і ў святочна-абрадавым кантэксце (сумесныя будзённыя формы баўлення часу, сямейныя і каляндарныя святы і да т.п.), у межах якіх, паміж іншым, адбывалася засваенне мадэляў міжполавых стасункаў.

Улічваючы значны аб’ём гаспадарчых абавязкаў, якія выконвалі маладыя людзі, а таксама даволі жорсткую сістэму рэгламентацыі штодзённых паводзін, можна меркаваць, што ў працэсе выканання гэтых абавязкаў камунікацыя, што выходзіла за іх межы, была досыць абмежаваная.

Зусім іншымі параметрамі вылучаецца час, які моладзь бавіла па-за працай. Т. А. Бернштам адзначае, што, ў параўнанні з дарослымі, моладзь праводзіла свой час адпачынку значна больш актыўна [1, с. 230], і менавіта тут атрымлівала магчымасць для паўнавартаснай камунікацыі.

Сярод супольных будзённых формаў баўлення моладззю часу найбольшую цікавасць уяўляюць так званыя “вячоркі” – звычай збірацца ў адной хаце для сумеснай працы і адпачынку. Варта заўважыць, што вячоркі не насілі выключна забаўляльнага характару, так як прадугледжвалі выканне пэўных працоўных аперацый (прадзенне або вышыванне для дзяўчат, пляценне лапцей, выразанне лыжак для хлопцаў) [3, с. 131], што можна разглядаць як своеаблівую імітацыю сямейнага жыцця на гаспадарча-пабытовым узроўні. Аднак, нашмат больш важным уяўляецца социякультурны зрэз міжполавай камунікацыі падчас вячорак, паколькі менавіта тут набываўся досвед псіхалагічна-эмацыйнага і фізічнага ўзаемадзеяння паміж паламі.

Адной з цікавейшых крыніц, прысвечанай феномену вячорак, з’яўляецца праца М. В. Доўнар-Запольскага “Нататкі па беларускай этнаграфіі”, апублікаваная ў другім выпуску часопіса “Жывая даўніна” за 1893 г. У дадзенай працы аўтар змясціў некалькі важных назіранняў, якія дазваляюць зрабіць выснову аб функцыях вячорак, як важнага кампанента сацыялізацыі моладзі і элемента яе камунікатыўных практык.

Найперш, варта згадаць адзначаную даследчыкам абавязковасць наведвання вячорак для маладых людзей, што выдатна ўсведамлялася прадстаўнікамі старэйшага пакалення: “сяляне глядзяць на наведванне іх дзецьмі вячорак як на абрад, усталяваны дзядамі, і таму абавязковы па звычаю… Маці будзе сур’ёзна засмучана, калі яе дачка не хоча наведваць вячорак…” [4, с. 291]. Акрамя таго, да паводзін маладых людзей (асабліва дзяўчат) на вячорках існавалі пэўныя патрабаванні: “Хлопцы падсаджваюцца да дзяўчат, справа не абыходзіцца без абдымкаў, пацалункаў, шчыпкоў. Увогуле, пэўная вольнасць у адносінах на вячорках не толькі дапускаецца, але нават патрабуецца звычаем, прызнаецца законам, і дзяўчына можа быць выключана са сходаў, калі занадта старанна супраціўляецца звычайным жартам. Зрэшты, не варта думаць, што жарты гэтыя і вольнасці заходзяць вельмі далёка ці набываюць не зусім прыстойны выгляд” [4, с. 290].

Аўтар звяртае ўвагу, што “на вячорках не існуе розніцы паміж багатым і бедным хлопцам, прыгожым і непрыгожым. Усе аднолькава роўныя. Самы бедны і самы непрыгожы можа падсесці да прыгожай і багатай дзяўчыны, жартаваць з ёю, незалежна ад таго, сімпатызуе яна яму, ці не…. Дзяўчына не павінна абражаць хлопца ўдарам, грубым словам і інш. [4, с. 290]. Разам з тым, па сведчанні аўтара, адносіны паміж маладымі людзьмі, якія ўсталёўваюцца на вячорках, далёка не заўсёды вядуць да заключэння шлюбаў паміж імі. Нягледзячы на адзначаную ім тэндэнцыю да ўсё больш частага ўступлення ў шлюб на падставе сімпатый, больш характэрную для малых сем’яў, “у вялікіх сем’ях, дзе агульны рэжым стаіць вышэй пачуццяў, … там яшчэ і зараз хлопца жэняць, а дзяўчыну выдаюць замуж, мала стасуючыся з іх жаданнямі” [4, с. 292].

Акрамя таго, па сведчанні М. В. Доўнар-Запольскага, “дзяўчына не на вячорках нізавошта не дазволіць хлопцу нават самых нявінных заляцанняў, нават хлопцу, які ёй падбаецца. … На гэты конт беларускія дзяўчаты вельмі далікатныя” [4, с. 290].

Такім чынам, можна канстатаваць, што вячоркі ў межах камунікатыўных моладзевых практык выступаюць менавіта ў якасці асяродка “гульні”, спосабу сімвалічнай імітацыі міжполавых стасункаў, з дапамогай якога набываецца неабходны досвед. Разам з тым, далёка не заўсёды адносіны паміж маладымі людзьмі, што складваюцца на вячорках, прыводзяць да заключэння шлюбу паміж імі. З іншага боку, асаблівасці моладзевай камунікацыі падчас вячорак садзейнічаюць фармаванню ўяўленняў аб раўнапраўі жанчыны і праекцыі гэтых уяўленняў на будучае сямейнае жыццё: “Хлопец звяртаецца да дзяўчыны, як да роўнай сабе, ажаніўшыся, ён захоўвае гэтыя ж адносіны і да сваёй жонкі” [4, с. 291].

Абрадавы аспект моладзевых камунікатыўных практык увасабляецца, ў першую чаргу, у межах каляндарна-абрадавага цыклу. Т. А. Бернштам заўважана пэўная заканамернасць ва ўзрастанні моладзевай актыўнасці на адкрытай прасторы на працягу каляндарнага перыяду ад вясновых святаў да Купалля, пры гэтым даследчыца адзначае, што міжполавая камунікацыя напачатку гэтага перыяду выяўляецца досыць слаба [1, с. 232–237]. Пацвярджаецца гэта і беларускім матэрыялам: шматлікія этнаграфічныя крыніцы фіксуюць паасобную абрадавую актыўнасць дзяўчат (радзей хлопцаў) падчас Гукання вясны, ваджэння вясновых карагодаў, траецкага “кумавання”, ваджэння “Кусты” і да т.п. У сувязі з гэтым нельга не заўважыць, што камунікатыўныя практыкі ў гэты каляндарны перыяд разгортваюцца ў асноўным у межах сваёй полаўзроставай групы і накіраваныя на ўсталёўванне адпаведных сацыяльных стасункаў – па вызначэнні Т.А. Бернштам, “групавой арганізацыі” [1, с. 232]. Найбольш характэрным прыкладам, на нашу думку, можна лічыць траецкае “кумаванне”, якое ў далёкім мінулым сімвалізавала “наступленне паўналецця, сталасці дзяўчат, пераход іх у групу дарослых членаў абшчыны” [5, с. 280].

Пік моладзевай актыўнасці ў каляндарным цыкле прыпадае на Купалле, пры гэтым, у адрозненне ад пачатку вясновa-летняга перыяду, яно ж становіцца і кульмінацыяй міжполавай абрадавай камунікацыі моладзі на адкрытай прасторы. У кантэксце разглядаемай тэмы вартым увагі з’яўляецца, з аднаго боку, сімвалічна-рытуальнае проціпастаўленне абрадавых груп хлопцаў і дзяўчат, увасобленае ў купальскім абрадавым фальклоры ў выглядзе тэкстаў кшталту “а ў дзевачак праўда ёсць..., а ў мальцоў праўды нет”; а таксама ў досыць багатым асартыменце песень-“дражнілак” [6, с. 150 , 176-180].

З другога боку, лейтматывам купальскага фальклору становіцца тэма шлюбу, рэалізаваная, што адметна, як на боскім, так і на чалавечым ўзроўнях светабудовы: “Купала, Купала, / Дзе ты начувала? / Начувала ночку / Ў Бога на краёчку / А Бог сына жэніць / Ілля пірагі пякець” [7, с. 129 ]; “А на гарэ – царкоўка, / На царкоўцы – макоўка, / На макоўцы – гнядзечка, / А ў гняздзечку - яечка / На яечку – ластоўка, / Яна сядзіць высока, / Чуіць-відзіць далёка, / Што ў Полацку дзеіцца, / Дзевяць мальцоў жэніцца” [6, с. 300 ].

Само па сабе Купалле, паводле сведчанняў этнаграфічных крыніц, вылучалася супольнымі абрадавымі дзеяннямі хлопцаў і дзяўчат (напрыклад, скіраванымі на абарону ад ведзьмаў), сумеснымі карагодамі і скачкамі праз вогнішча, а таксама рытуальнымі бясчынствамі і паслабленнем нормаў міжполавых стасункаў. [8, с. 235, 237, 240, 245, 309]. Аднак, па назіранні Т. А. Бернштам, “абшчына не кантралявала адносіны моладзі на гэтых ігрышчах, а бацькі не мелі права забараняць сваім дзецям (асабліва дзяўчатам) у іх удзельнічаць: летні сонцаварот

быў паваротнай кропкай у моладзевай гульні, якая сімвалізавала здзейснены пераход дзяўчыны ў дарослы стан, які даваў права на шлюбныя адносіны” [1, с. 236].

Восеньская і зімовая каляндарная абраднасць характарызуюцца паступовым змяншэннем моладзевай актыўнасці на адкрытай прасторы і ўзмацненнем шлюбных матываў у абрадавых дзеяннях і фальклоры. Падобная тэматыка, напрыклад, вельмі ўласціва летняй і восеньскай талочнай абраднасці, у прыватнасці, жніўнай[1]. Больш таго, “для вясковых дзяўчат удзел у талацэ – бадай што адзіная ўмова заявіць аб сабе, аб сваёй спрытнасці і працаздольнасці, бо на гэтых калектыўных работах адбываецца рашучая ацэнка вясковых прыгажунь сялянкамі-маці, якія маюць дарослых сыноў” [9, с. 35].

У найбольшай ступені сярод абрадаў восеньска-зімовага цыклу шлюбная тэматыка характэрна для калядных ігрышчаў, асабліва для “Жаніцьбы Цярэшкі”. Па сваёй сутнасці, “Жаніцьба Цярэшкі” ўяўляе сабой сімвалічнае “вяселле” усёй вясковай моладзі, што дасягнула шлюбнага ўзросту. Абрадавыя дзеянні ўтрымліваюць шматлікія адсылкі да вясельнага абраду [10, с. 64–68], а песні, што іх суправаджаюць, насычаны шлюбнымі матывамі: “Будзем мы піва варыць, / Будзем сыноў жаніць, / Будзем гарэлку гнаць, / Дочак замуж аддаваць” [10, с. 68]. Пры гэтым, як і на сапраўдным вяселлі, асноўную кіруючую і распарадчую функцыю выконваюць прадстаўнікі узроставай групы дарослых – сімвалічныя “бацька” і “маці” маладых людзей, што бяруць удзел у рытуальным дзеянні [10, с. 64–66]. На іх жа ўскладаецца адказная задача падбору пар, што, апрача іншага, патрабуе і ўліку асабістых сімпатый паміж хлопцамі і дзяўчатамі. Адметна, што камунікацыя паміж удзельнікамі будавалася ў асноўным у выглядзе выканання кароткіх-песень-“цярэшак”, якія не толькі каментавалі само дзеянне, але і дэманстравалі эмоцыі і пачуцці маладых людзей, іх стаўленне да падабранай пары: “Цвіцела ружа, цвіцела / Далі мне каго я хацела: / Белага, румянага, / Русага, кудравага”; і наадварот: “Стаяла рутанька на акне, / Стоючы ды зацвіцела. / Далі дзядулічку мне, / Каго я ні хацела” [10, с. 227, 251].

З пункту гледжання соцыякультурнай значнасці ўдзел у “Жаніцьбе Цярэшкі” як неабходным этапе абрадавай сацыялізацыі моладзі быў такім жа абавязковым, як і ўдзел у вячорках. Сімвалічны “шлюб” паміж хлопцам і дзяўчынай, заключаны падчас гэтага абрадавага дзейства, дзейнічаў на працягу пэўнага часу. Паводле сцверджання М. Я. Нікіфароўскага, “назва мужа і жонкі паміж удзельнікамі гульні – хлопцам і дзяўчынай – захоўваеца надоўга, нават і тады, калі маладыя людзі ўступаюць у сапраўдныя, хоць і розныя шлюбы” [10, с. 67]. А. Я. Багдановіч у свой час адзначаў, што “гэтая гульня ў жаніцьбу служыць як бы прэлюдыяй да маючага адбыцца шлюбнага сезону, і многія парачкі ў выніку сапраўды злучаюцца шлюбнымі повязямі” [11, с. 92].

Такім чынам, камунікатыўныя практыкі моладзі ў беларускай традыцыйнай культуры маюць яскравую скіраванасць на мадэляванне адносін паміж паламі і падрыхтоўку да ўступлення ў шлюб, што ўвасабляецца як у будзённым, так і ў святочна-абрадавым кантэкстах камунікацыі.

### Спіс выкарыстаных крыніц

1. Бернштам, Т. А. Молодежь в обрядовой жизни русской общины XIX – начала XX в. / Т. А. Бернштам. – Л.: Наука, 1988. – 277 с.

---

[1] Падрабязней гл. Валодзіна, Т. В. Талака ў сістэме духоўнай культуры беларусаў / Т. В. Валодзіна – Мн.: Беларуская навука, 1997. – 135 с.

2. Довнар-Запольский, М. В. Очерки семейственного обычного права крестьян минской губернии / М. В. Довнар-Запольский // Исследования и статьи, Т.1. – Киев, 1909. – С. 1–60.
3. Мінько, Л. І. Вячоркі / Л. І. Мінько // Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. – Рэдкал: І.П. Шамякін (гал. рэд) і інш. – Мн.: БелСЭ, 1989. – С. 131.
4. Довнар-Запольский, М. В. Заметки по белорусской этнографии / М. В. Довнар-Запольский // Живая старина. – 1893 г. – Вып. 2. – С. 283–296.
5. Піліпенка, М. Ф. Кумаванне / М. Ф. Піліпенка // Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя. – Рэдкал: І. П. Шамякін (гал. рэд) і інш. – Мн.: БелСЭ, 1989. – С. 280.
6. Купальскія і пятроўскія песні / Уклад. А. С. Ліса, С. Т. Асташэвіч; Уклад. муз. часткі Г. В. Таўлай; Рэд. А. С. Фядосік. – Мн. : Навука і тэхніка, 1985. – 631 с.
7. Мажэйка, З. Я. Песні беларускага Паазер'я / З. Я. Мажэйка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1981. – 492 с.
8. Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / Уклад., класіфікацыя, сістэматызацыя матэрыялаў і камент. А. І. Гурскага; Уступ, арт. А. І. Гурскага, А. С. Ліса. 2-е выд., выпр. – Мн.: Беларуская навука, 2003. – 429 с.
9. Валодзіна, Т. В. Талака ў сістэме духоўнай культуры беларусаў / Т. В. Валодзіна – Мн.: Беларуская навука, 1997. – 135 с.
10. Жаніцьба Цярэшкі / Уклад. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Л. М. Салавей; Уклад., сістэм. і расшыфроўка муз. матэрыялу, уступ. арт. і камент. І. Дз. Назінай. – Мн.: Навука і тэхніка, 1992. – 519 с.
11. Богданович, А. Е. Пережитки древнего миросозерцания у белоруссов: этнографический очерк / А. Е. Богданович. – Репринт. издание. – Мн.: Беларусь, 1995. – 186 с.